Фота Надзеі БУЖАН.

TV@R

«ХАЧУ РАБІЦЬ ЭМАЦЫЙНЫЯ ІНТЭРВ'Ю»

Напярэдадні адпачынку вядучы АНТ вядомы шоумен Яўген БУЛКА ў інтэрв'ю «Звяздзе» распавёў легенду пра залатыя пяскі, узгадаў, як пачынаў тэлекар'еру ў касцюме бусляняці і падзяліўся сваім самым свежым адкрыццём з эфіру праграмы «Наша раніца».

«Усіх прымусілі загаварыць пра хлопца, якога называлі «Хітошам»

— Яўген, дзе вы вырашылі правесці адпачынак?

— У Грэцыі, у рэгіёне Халкідыкі. Раней з жонкай мы любілі актыўна адпачываць, ездзіць, нешта глядзець, а цяпер, калі ў нас нарадзілася дзіця, нам патрэбны сямейны адпачынак з макімальным камфортам, вітамінамі, рэлаксам. Напярэдадні вялікія праекты. І зараз трэба набрацца сіл, каб пасля ў іх пагрузіцца.

— А ці памятаеце, як адпачывалі летам у дзяцінстве?

— Я мог па некалькі змен праводзіць у лагеры «Арляня», што непадалёк ад майго Бабруйска. Жалезабетонныя фігуры, драўляныя жылыя карпусы, прыбіральня за 500 метраў ад жытла — усё гэта складала адпаведны антураж. Аднак гэта быў час шалёнага, рамантычнага, творчага праяўлення і пастаяннага ўдасканальвання камунікатыўных навыкаў. Добрая школа жыцця. Найлепшымі гульнямі былі тыя, якія мы прыдумвалі самі. За тэрыторыяй лагера знаходзіўся схіл да берага ракі. Было відавочна, што людзі з яго бралі пясок. А ён там такі драбнюткі, такі прыгожы... Карацей, мы прыдумалі, што гэта залатыя пяскі, якія абавязкова павінны быць пракляты. І калі ўсе знаходзіліся на дыскатэцы альбо на спартыўных спаборніцтвах, заўжды хацелася зганяць за тэрыторыю і назбіраць залатога пяску.

— А пад што танцавалі на дыскатэках?

— Як толькі пачыналася песня «Кока Джамба», адразу кідаўся ў пляс. Патанчыць пад гэтую песню было святой справай! Ну і, безумоўна, пад «It's my life» Доктара Албарна. А з геаграфічна набліжанага падабаўся гурт «Кар Мен».

— Цікава, што мае першыя ўспаміны пра вас звязаны таксама з песнямі. Гэта быў дзіцячы конкурс «Сузор'е надзей», які вы вялі ў касцюме нейкага звера...

— Я там заўжды быў у дзіўных касцюмах. Гэта шыкоўны піяр. Бо літаральна ўсіх прымусілі загаварыць аб нейкім хлопцы ў апрананні бусляняці. Мяне называлі «Хітошам». Мне тады было каля 20 гадоў. Кастынг не праводзілі. Гэта была выпадковая прапанова, якой я і скарыстаўся. Маёй напарніцай стала Воля Сацюк, дзяўчынка, якая адкрыла для Беларусі дзіцячае Еўрабачанне. У яе была мянушка «Шансі». Атрымліваецца, што яна дае шанц, а «Хітоша» ператварае песню ў хіт. Падобны праект быў шасцігадзінным выпрабаваннем песнямі і танцамі. Аўдыторыя — дзеці, іх бацькі. Але я адчуваў сябе патрэбным, важным, аўтарытэтным чалавекам.

— Можна толькі здагадвацца, колькі фотакартак з вашай выявай знаходзіцца ў альбомах былых удзельнікаў «Сузор'я надзей»...

— Спачатку шасцігадзінны канцэрт, а пасля такая ж фотасесія *(смяецца)*. Некаторыя з былых удзельнікаў праекта, дарэчы, сталі даволі вядомымі артыстамі. Я абвяшчаў выхад на сцэну Егіязара Фарашана, будучага ўдзельніка Еўрабачання ў гурце «3+2», Максіма Сапацькова, які пасля стаў Максам Лорэнсам, Б'янкі...

— На журфаку БДУ вы вучыліся па спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя», а ў выніку аказаліся на тэлебачанні.

— Калі ў старэйшых класах прыязджаў у Мінск і наведваў БДУ, разумеў, што буду вучыцца тут. Праўда, заглядваў я ў галоўны корпус і нават не ведаў, дзе знаходзіцца факультэт журналістыкі. Я павінен быў стаць піяршчыкам, але так склалася, што на 3-м курсе атрымаў прапанову дапамагчы ў адным тэлевізійным праекце. Ну, а «Сузор'е надзей» стала для мяне вялікай стартавай пляцоўкай, дзякуючы якой мяне размеркавалі ў Белтэлерадыёкампанію. Тады для ўраджэнца Бабруйска застацца ў Мінску было шанцаваннем.

— Калі толькі пачыналі працаваць на БТ, якім тэлебачаннем захапляліся?

— У той час я жыў альбо ў інтэрнаце, альбо на здымных кватэрах. Працы — шмат, а таму тэлевізар я амаль не глядзеў. Праўда, тады толькі-толькі з'явіўся Comedy club, мне па-сапраўднаму стала цікава. І нават з'явілася ідэя: «Вось бы сябе там паспрабаваць». І хаця я не быў удзельнікам каманды КВЗ, усё роўна туды трапіў.

«Людзі адляталі ад быкоў, як тканінныя цацкі»

— Якія тэлепраекты са сваім удзелам лічыце найбольш удалымі?

— Мюзікл «Паўлінка NEW», «Бітва тытанаў»...

— А літаральна сёння даведаўся, што зараз вы здымаецеся ў фільме пад назвай «Яны».

— Раней я іграў у серыяле «Вышэй за неба», а тое, што раблю зараз, гэта, хутчэй, грамадскія пачаткі. Я не рызыкну назваць гэта сур'ёзнымі здымкамі для сябе. У мяне маленькая роля на тры хвіліны. Праект небюджэтны. Здымае ўсё Дзіяна Цыкунова, рэжысёр-аматар, дзяўчынка-адзінацацікласніца, якая марыць стаць прафесіяналам. Але я ў яе веру. І хачу ўбачыць яе рэжысёрам, які возьмецца за вялікае бюджэтнае кіно.

Сёння вырасла цэлае пакаленне «вялікага пальца», — людзі, зняволеныя смартфонамі і планшэтамі...

— Вы неяк сказалі, што не пайшлі вучыцца на акцёра, бо ім можна стаць без спецыяльнай адукацыі. А ці збіраецеся самі атрымаць яшчэ адзін дыплом?

— Я думаю, што так. Магчыма, ён будзе звязаны з філалогіяй, лінгвістыкай, а можа, і з гісторыяй. Пакуль канкрэтна сказаць не магу.

— Дарэчы, тэлевізійны праект «Бітва тытанаў» здымалі ў Францыі, дзе вас пастаянна акалялі замежнікі. Валоданне замежнай мовай спрыяла працы?

— Безумоўна. Без гэтага мы б нічога і не знялі. Многія прома-ролікі здымалі ў даволі складаных умовах, бо для гэтага мы запрашалі людзей наўпрост з вуліцы. А еўрапейская публіка да падобнага ставіцца даволі асцярожна. Для гэтага трэба атрымаць шмат дазволаў у Францыі. Мы пра тое не ведалі, а таму, напэўна, і знялі.

Гэты праект, дарэчы, здымалі пад Парыжам, а пражывалі мы ў розных гарадах. Напрыклад, жылі насупраць Ла Сантэ, самай буйной французскай турмы, а самі нават не ведалі аб гэтым.

— Удзел у праекце быкоў дабаўляў асаблівую «разынку». Траўматычных выпадкаў хапала?

— Людзі траплялі пад быкоў і адляталі, як тканінныя цацкі. Але самы драматычны выпадак здарыўся з украінскай спартсменкай. Яна, прафесійны баксёр, напрыканцы адной з эстафет зламала нагу. Гэта было вельмі трагічна.

— Сумнае відовішча, насамрэч...

— Часам у сумнае відовішча ператвараліся расійскія балельшчыкі. Часам Дзмітрый Нагіеў, вядучы расійскай версіі, дазваляў сабе правакацыі, якія пасля прайшлі ў эфір тэлебачання. З беларускай каманды хацелі зрабіць пасмешышча. Хаця мы былі самымі моцнымі канкурэнтамі і расіяне ўвесь час баяліся, што мы іх пераможам. Для іх гэты праект быў прынцыповым. Расія ў ім 10 гадоў, і ім абавязкова трэба заўжды паказваць, як яны перамагаюць.

— У «Нашай раніцы» вы працуеце з 2006 года. Хто з гасцей праграмы вас найбольш уразіў?

— Да нас прыходзіла вельмі шмат людзей. Апошнім адкрыццём для мяне стаў інтэрнэт-персанаж Наталля Трэя. Я раней не ведаў пра яе, але, як аказваецца, яна даволі вядомы персанаж у сеціве. Наталля — беларуска, жыве ў Маскве. У яе страшэнна прыгожыя каляровыя кліпы, якія яна робіць самастойна. «За кадрам» я задаваўся пытаннем, як знайсці да яе падыход, раскрыць асобу для сябе, для гледача. Мне здавалася, гэта будзе складана. У выніку чалавек паказаў сябе настолькі цікавай, непасрэднай, глыбокай асобай, што мне хацелася ёй апладзіраваць.

— А ці прапаноўвалі вы для ўдзелу ў праграме сваіх кандыдатаў?

— Так, я даволі часта запрашаў тых, хто мог бы быць цікавым у эфіры. Гэта нармальная практыка, калі вядучы не проста гаворыць, але і актыўна ўдзельнічае ў стварэнні праекта. Можна з героем пагаварыць так, што ў тэлегледача працягнецца сон, а можна з усяго гэтага зрабіць невялічкае шоу з правакацыямі. Некаторыя праграмы былі настолькі эмацыйнымі арэлямі, што мы не толькі рагаталі, але і задавалі пытанні, якія прабівалі чалавека на слязу. Мне здаецца, што на нашым тэлебачанні якраз не хапае жанру эмацыйнага інтэрв'ю. Дзелавых, аналітычных гутарак хапае, а вось такіх, як, напрыклад, робяць у Расіі ў рамках шыкоўнай праграмы «Сам-насам з усімі», у нас замала. І гэта менавіта той фармат ток-шоу, у якім я хацеў бы сябе праявіць.

— Даволі эмацыйнымі атрымліваюцца невялічкія гутаркі ў таго ж Івана Урганта...

— Па фармаце яны падобныя. Але праграма Урганта — не адкрыццё. Шмат такіх шоу, з якіх ствараюць гумарыстычныя свята, карнавал, зроблена ў ЗША. А я кажу пра праграму, у якой чалавек у незнаёмых умовах, без гальштука, калі афіцыйная асоба, адказвае на пытанні, звязаныя не толькі з яго прафесіяй, але і з перажываннямі. На мой погляд, нашым людзям вельмі не хапае чалавечых душаў, раскрытых на айчынным экране. Ці ахвотна расказваюць пра сябе чыноўнікі? Не. А пасля кажуць, што пра іх ніхто не ведае. Ёсць прычыны, праз якія людзі, пра якіх гледачы павінны ведаць, наадварот, хаваюцца за спінамі сваіх памочнікаў. І іх інтэрв'ю — 30-секундны запіс у праграме навін. Гэта тычыцца і артыстаў, і спартсменаў.

Спробай эмацыйнага інтэрв'ю з'яўляецца рубрыка «За кубачкам кавы Якабс» падчас «Нашай раніцы». Але яе хранаметраж — 6 хвілін. За гэты час можна абмяняцца кампліментамі, запытацца пра планы. За гэты час «разварушыць» чалавека вельмі складана.

— А ці не было жадання рабіць падобны праект для газет ці часопісаў?

— Пэўны час я працаваў рэпарцёрам у бабруйскай газеце. Але інтэрв'ю для друкаваных сродкаў масавай інфармацыі — іншая справа. Многае залежыць не толькі ад таго, як скажа герой, але і ад таго, як яго словы надрукуюць. Адзін і той жа адказ можна запісаць па-рознаму. А тэлебачанне не дасць магчымасці зманіць. Калі суразмоўца маўчыць, апускае вочы, як гэта пакажаш у газеце? Рэмаркамі?

— Вам было б цікава, калі б падобная ідэя рэалізавалася ў рамках інтэрнэт-тэлебачання?

— Нягледзячы на тое, што інтэрнэт падаўляе тэлебачанне, многія не ўспрымаюць яго сілы і яшчэ больш баяцца яго. З прычыны занятасці запрасіць кагосьці на тэлебачанне часам немагчыма, а вы кажаце пра інтэрнэт. Зараз менавіта тэлебачанне можа больш гэтаму садзейнічаць.

«Буду вадзіць дзіця ў мастацкія і спартыўныя гурткі»

— Мой старэйшы таварыш неяк сказаў наступнае: «Да трыццаці гадоў жыццё ішло павольна, я нікуды не спяшаўся, а пасля яно паляцела, не паспяваеш за ім». Адчуваеце гэта?

— Безумоўна, асабліва пасля нараджэння дзіцяці. Пачынаеш больш сачыць за часам, думаеш, ці зрабіў ты тое, што планаваў. І больш перажываеш з прычыны таго, што ўжо не маеш магчымасці гэта выканаць.

— Яўген, калі ваша дзіця скажа «Тата, я хачу працаваць на тэлебачанні!», якім будзе ваш адказ?

— Я б спытаў: «А што ты для гэтага робіш? Я не вазьму за ручку і не павяду цябе. А калі ў цябе не атрымаецца? Я буду максімальна спрыяць твайму развіццю». Пастараюся запаўняць кожную хвіліну свайго дзіцяці і вадзіць яго ў мастацкія, спартыўныя і музыкальныя гурткі. Так, магчыма, будзе крыху жорстка. Але я лічу, што гэта зараз неабходна. Чым больш сёння займаеш дзіця, тым больш выгодна ён будзе выглядаць на фоне сваіх аднагодак. Бо сёння вырасла цэлае пакаленне «вялікага пальца», — людзі, зняволеныя смартфонамі і планшэтамі...

Тарас ШЧЫРЫ.
taras@zviazda.by